Весці БДПУ. Серыя 1. 2024. № 3. С. 89–93

УДК [81›373:811.161.3]:82-1 М.Шабовіч

# АКАЗІЯНАЛЬНЫЯ ПРЫСЛОЎІ І СЛОВЫ КАТЭГОРЫІ СТАНУ Ў ПАЭЗІІ МІКОЛЫ ШАБОВІЧА

**Т. А. Астапчык,**
*кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры мовазнаўства
і лінгвадыдактыкі Беларускага
дзяржаўнага педагагічнага
ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0009-5679-4106*

Паступіў у рэдакцыю 25.04.2024.

UDC [81'373:811.161.3]:82-1 М.Шабовіч

# OCCASIONAL ADVERBS AND WORDS OF THE CATEGORY OF STATE IN MIKOLA SHABOVICH'S POETRY

**T. Astapchyk**
*PhD in Philology, Associate Professor
of the Department of Linguistics
and Linguodidactics, Belarusian
State Pedagogical University
named after Maxim Tank*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0009-5679-4106*

Received on 25.04.2024.

У артыкуле разглядаюцца аказіянальныя прыслоўі і словы катэгорыі стану ў паэзіі Міколы Шабовіча, іх структурныя разнавіднасці і асаблівасці функцыянавання ў мастацкім тэксце. Усяго зафіксавана 97 адзінак, сярод якіх вылучаюцца: 1) прыслоўі ці словы катэгорыі стану, утвораныя ад кадыфікаваных або некадыфікаваных ад'ектываў з дапамогай суфікса *-а*; 2) складаныя прыслоўі ці словы катэгорыі стану, утвораныя ад двух (радзей – трох) прыслоўяў ці слоў катэгорыі стану; 3) прыслоўі ці словы катэгорыі стану, у якіх адзначаецца адсутнасць склада ці, наадварот, наяўнасць дадатковага склада (у параўнанні з кадыфікаваным словам). Адзначаецца, што аказіянальныя прыслоўі і словы катэгорыі стану ствараюцца з мэтай надаць дзеянню ці прыкмеце ўнікальную, небанальную, вычарпальную характарыстыку і з'яўляюцца сведчаннем багатых дэрывацыйна-семантычных магчымасцей моўнай сістэмы.

*Ключавыя словы*: кадыфікацыя, аказіянальныя словы, прыслоўі, словы катэгорыі стану, Мікола Шабовіч, сучасная беларуская паэзія.

The article deals with occasional adverbs and words of the category of state in Mikola Shabovich's poetry, their structural varieties and features of functioning in the artistic text. A total of 97 units were recorded, among which the following stand out: 1) adverbs or words of the category of state, formed from codified or non-codified adjectives with the help of the suffix *-a*; 2) compound adverbs or words of the category of state, formed from two (rarely three) adverbs or words of the state category; 3) adverbs or words of the category of state, in which the the absence of a syllable or, on the contrary, the presence of an additional syllable (compared to the codified word) is noted. It is marked that occasional adverbs and words of the category of state are created in order to give an action or a sign a unique, non-trivial, comprehensive characteristic and can be seen as the evidence of the rich derivational and semantic possibilities of the language system.

*Keywords:* codification, occasional words, adverbs, words of the category of state, Mikola Shabovich, modern Belarusian poetry.

Кожная літаратурная мова няспынна папаўняецца новымі словамі. Асаблівую цікавасць прадстаўляюць сабой аказіяналізмы, або індывідуальна-аўтарскія нелагізмы, якія ўзнікаюць у паэтычным маўленні і ілюструюць дэрывацыйна-семантычныя магчымасці моўнай сістэмы. Мікола Шабовіч – вядомы беларускі паэт, адзін з самых пранізлівых лірыкаў сучаснай беларускай літаратуры, а навуковая дзейнасць Міколы Віктаравіча была прысвечана менавіта аказіянальным словам. Актуальнасць даследавання тлумачыцца вострай неабходнасцю вывучэння беларускай аказіянальнай лексікі, што зафіксавана ў сучаснай паэзіі, падрыхтоўкай слоўнікаў аказіянальнай лексікі. Акрамя таго, актуальнасць тэмы вызначаецца бясспрэчнай важнасцю выяўлення і аналізу некадыфікаванай лексікі як неад'емнага складніка той ці іншай моўнай (наіўнай) карціны свету.

Матэрыял для даследавання (97 аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану) сабраны метадам скразной выбаркі з паэтычных кніг Міколы Шабовіча «Падары мне сваю адзіноту» (2002), «Мая надзея» (2006), «Маладыя мроі маладога лета» (2017), «Пад маміным крылом...» (2021). Мэта артыкула – разгледзець структурныя разнавіднасці аказіянальных прыслоўяў Міколы Шабовіча, выявіць стылістычныя асаблівасці іх функцыянавання ў паэтычных творах.

Сярод аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану, зафіксаваных у паэзіі М. Шабовіча, можна выдзеліць 3 групы адзінак:

1) утвораныя ад кадыфікаваных або некадыфікаваных ад'ектываў з дапамогай суфікса *-а*;
2) складаныя прыслоўі ці словы катэгорыі стану, утвораныя ад двух (радзей – трох) прыслоўяў ці слоў катэгорыі стану;
3) прыслоўі ці словы катэгорыі стану, у якіх адзначаецца адсутнасць склада ці, наад-

варот, наяўнасць дадатковага склада (у параўнанні з кадыфікаваным словам).

Сярод прыслоўяў і слоў катэгорыі стану, утвораных ад кадыфікаваных ці некадыфікаваных прыметнікаў з дапамогай суфікса *-а* (**1**), вылучаюцца наступныя падгрупы:

1.1. прыслоўі або словы катэгорыі стану, утвораныя ад кадыфікаваных прыметнікаў з суфіксам *-к-*: **зіхотка**: *Ты так ярка, **зіхотка** цвіцеш, / Палымяна агнеюцца вусны*;

1.2. прыслоўі і словы катэгорыі стану, утвораныя ад кадыфікаваных прыметнікаў з суфіксам *-н-*: **навальнічна**: *Але, пакуль халодныя дажджы / І **навальнічна** хмары мітусяцца, / Глядзяць бярозкі ўслед з-пад паранджы... / Дай бог хутчэй ім лета дачакацца*; **полымна**: *Да новых стрэч, гандлярка! Твой паэт – / З табой заўжды. Ён рад цябе вітаць. / Зірні ў акно: нявесціцца Сусвет, / І зоркі дзве так **полымна** гараць*; **віхурна**: *Люблю цябе, адну цябе люблю, / Няхай наўкол сцюдзёна і **віхурна***; **спакусна**: *Ты так **спакусна** клеіла канверты, / Я на цябе глядзеў бы цэлы дзень – / Твой верны паж, твой легкадумны Вертэр, / Твой летуценна-недаступны цень*; **мройна**: *За бела-сінім далягля-дам / Ці нашы **мройна** ткуцца сны?*

На думку М. Шабовіча, некаторыя дэрываты, утвораныя ад прыметнікаў з суфіксам *-н-*, маюць двайную словаўтваральную матывацыю і могуць семантычна суадносіцца як з прыметнікамі, так і з назоўнікамі [1, с. 119]: ***навальнічна*** – як у навальніцу, ***віхурна*** – нібы віхур.

Сярод зафіксаваных адзінак неабходна адзначыць прыслоўі, утвораныя ад кадыфікаваных дзеепрыметнікаў з суфіксамі *-н-*, *-ан-*: **счаравана** (ад счараваны): *А дождж, што хмараю павіс, / Застыў-стаіўся **счаравана**, / І званнем ты «ПЯШЧОТЫ МІС» / Была ў той міг каранавана*; **няпрошана** (2 разы): *Даруйце слёзы пані Восені – / Яна саромеецца слёз. / А што рабіць, калі **няпрошана** / Лістота сыплецца з бяроз?; Адчыніш дзверы насцярожана – / І стане бела ад святла. / «Даруй, – ты скажаш, – бо **няпрошана** / Спакой парушыць твой прыйшла».* Прыслоўе ***зачаравана*** з'ўляецца кадыфікаваным словам, засведчана ў слоўніках літаратурнай мовы, аднак паэт свядома ўжывае аказіянальнае прыслоўе ***счаравана***, відаць, з версіфікацыйнымі мэтамі, дзеля захавання рытму ў радку;

1.3. прыслоўі, утвораныя ад кадыфікаваных прыметнікаў з суфіксамі *-ліў-*, *-ыст-* (надаюць колькасна-ацэначнае або якасна-ацэначнае значэнне): **узрушліва** (ад узрушлівы): *А што застаецца? Музыка / Тых дзён, што бруілі **ўзрушліва** / Ад першай сцяжынкі вузенькай / Да многіх дарог спакуслівых*; **вячыста** (ад вячысты): *Крокам смелым **вячыста** ідзі, / Хай суседкі глядзяць-азіраюцца*; **сняжыста** (ад сняжысты): ... *Нібы няма астуднае зімы, / Якая так **сняжыста** абдымае*;

1.4. прыслоўі і словы катэгорыі стану, утвораныя ад кадыфікаваных прыметнікаў з суфіксам *-ов-*, *-ын-*: **зімова**: *Шаптаць малітвы і замовы: / Яна ж – так варта цёплых слоў, / Пакуль не згасла шчэ любоў, / Пакуль на сэрцы не **зімова**...*; **вяснова, васількова**: *Пагляд сустрэну – і **вяснова** / Адразу стане на душы. / Так светла, вабна, **васількова** / Твой вобраз мроіцца ў цішы...*; **вечарова**: *Твая каса драмала на плячы / Так **вечарова**, мройна...*; **птушына**: *Як добра, што мінае час самоты / І зноў гучыць **птушына** ў вышыні / Цудоўная мелодыя пяшчоты / І абяцае радасныя дні.*

Неабходна адзначыць, што суадносныя ад'ектывы ў такіх выпадках нярэдка з'яўляюцца адноснымі прыметнікамі, што набылі якаснае значэнне. Можна дапусціць меркаванне, што падобныя прыслоўі могуць матывавацца ў тым ліку і назоўнікамі: **васількова** – як васілёк, **птушына** – як птушка. Заўважаны выпадкі ўжывання паэтам адразу некалькіх аказіянальных прыслоўяў у межах аднаго сказа, страфы;

1.5. словы катэгорыі стану, утвораныя ад некадыфікаваных прыметнікаў з суфіксам *-ов-*: **шарагова**: *Няўжо такое – **шарагова**? / Няўжо такое – немінуча?*;

1.6. прыслоўі, утвораныя ад прэфіксальна-суфіксальных (прэфіксальна-нульсуфіксальных) прыметнікаў (дзеепрыметнікаў): ***без'языка***: *І нам для шчасця непатрэбны словы – / Мы ўмеем **без'языка** гаварыць; **бяспромна**: Паасобку мы што на свеце? – / Ліхтары ў незямной цямрэчы, / Што так цьмяна, **бяспромна** свецяць, / Асыпаючы золь на плечы.* **злюцела**: *Самоціцца шлях. / Цішыня пазірае **злюцела***; **пачарнела**: *Здаецца, й дождж нядаўна шчэ гарэзіў / І напплывалі хмары **пачарнела**; **бяспутна**: На месцы спатыкаючыся роўным, / Мы так **бяспутна** некуды ішлі.*

Словы ***бязгнёзда, бяспутна, бяспромна, злюцела*** не маюць суадносных прыметнікаў у літаратурнай мове, што надае ім высокую ступень аказіянальнасці, надзвычайную вобразнасць і семантычную ёмістасць: ***бязгнёзда*** – без сталага месца жыхарства, ***бяспутна*** – без канкрэтнага напрамку, нематанакіравана, ***бяспромна*** – цьмяна, ***злюцела*** – жорстка, бязлітасна. У наступных радках заўважаны эфект гукапісу, што забяспечваецца ў тым ліку і зваротам да аказіянальных прыслоўяў: *Мы бязгнёзда жывём і бязглузда, / Летуценім калі-нікалі...; Рыжыкаў рыжань / Алёнку зрыжэла заве / Ў рыжую замець;*

1.7. прыслоўі і словы катэгорыі стану, утвораныя ад складаных прыметнікаў: ***ціхаплынна:*** *І нашы мары і гады / Плывуць удалеч **ціха-***

***плынна***; ***шматкветна***: *За якой гарою, / Дзе шукаць па свеце / Маладыя мроі / Маладога лета, / Што цвілі, буялі / Колісь так* ***шматкветна***...; ***легкакрыла***: *Ах, як мары ўзляталі ў вышынь* ***легкакрыла*** */ І адтуль на зямлю не хацелі вяртацца!..*; ***ціхаспеўна***: *Я музыку складаў, а ў вышыні / Так* ***ціхаспеўна***, *мякка і шчымліва / Трымцелі сінязорныя агні*; ***зорнаспеўна***: *Зірні, як молада світае, / Як* ***зорнаспеўна*** *ў вышыні!*; ***зімавейна***: *Не знікай у далеч, у вышынь, / Без цябе* ***зімавейна*** *ў Сусвеце*; ***весналіста***, ***жаўталіста***: *А дні нястрымана ляцяць, / Назад у снах адно вяртаюцца. / То* ***весналіста*** *шалясцяць, / То* ***жаўталіста*** *асыпаюцца.*

Сярод такіх лексем адзначаны 3 адзінкі, утвораныя ад кадыфікаваных складаных ад'ектываў (***ціхаплынна*** ад ціхаплынны, ***шматкветна*** ад шматкветны, ***легкакрыла*** ад легкакрылы). Такія прыслоўі могуць быць аднесены да патэнцыяльных, паколькі яны характарызуюцца высокай верагоднасцю ўвайсці ў лексічны склад літаратурнай мовы. Большасць аказіянальных прыслоўяў, утвораных ад складаных прыметнікаў, не маюць суадносных прыметнікаў у літаратурнай мове і створаны выключна са стылістычнай мэтай. Такія адзінкі яскрава ілюструюць арнаментальнасць мастацкага тэксту, жывапіс словам.

Беларуская граматыка лічыць правамоцным разглядаць прыслоўі з суфіксам *-а* як адпрыметнікавыя ўтварэнні [2]. Аднак неабходна адзначыць, што некаторыя аказіянальныя прыслоўі і словы катэгорыі стану могуць матывавацца і назоўнікамі. Дэкадзіраванне семантыкі складаных аказіянальных прыслоўяў дае падставы разглядаць некаторыя з іх як праcступенныя ўтварэнні з наступнай словаўтваральнай структурай: **ціхаспеўна** = ціх-і (+а) спеў + суфікс -на (складана-суфіксальны спосаб); **весналіста** = весн-і (+а) ліст + суфікс -а (складана-суфіксальны спосаб); **сонечнавока** = сонечн-ае (+а) + вок-а + суфікс -а (складана-суфіксальны спосаб).

Усяго зафіксаваны 35 аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану, утвораных ад кадыфікаваных ад'ектываў з дапамогай суфікса *-а*, 3 адзінкі з'яўляюцца складанымі словамі. 22 аказіянальныя прыслоўі і словы катэгорыі стану ўтвораны ад некадыфікаваных ад'ектываў з дапамогай суфікса *-а*, 10 адзінак з'яўляюцца складанымі словамі. Існаванне аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану, утвораных ад некадыфікаваных ад'ектываў, дазваляе «выказаць меркаванне, што пісьменнік, утвараючы прыслоўе, напачатку канструяваў прыметнік, аснова якога станавілася ўтваральнай для яго» [1, с. 118 ].

Асаблівай увагі заслугоўваюць прыслоўі (і словы катэгорыі стану), утвораныя шляхам аб'яднання двух (радзей – трох) прыслоўяў (**2**): ***задумна-мякка***: *Сягоння ты хоць крышачку бліжэй, / Глядзіш* ***задумна-мякка*** *з фотаздымка*; ***Спадзеўна-шчымліва***: *Што ж так* ***спадзеўна-шчымліва*** */ Сэрца пяе пра спатканне*; ***годна-смела***, ***адчайна-проста***: *Каму, скажы, ты спеліш пацалункі, / Каб несці іх, нібыта падарункі, / Так* ***годна-смела*** *і* ***адчайна-проста***... Зафіксавана 30 такіх кампазітаў.

Як адзначае сам М. Шабовіч, кампаненты такога складанага прыслоўя «з розных бакоў ці з аднаго боку характарызуюць адно і тое ж дзеянне або адну і тую ж прымету» [1, с. 121]. Такія кампазіты ўтварыліся спосабам чыстага складання і не маюць суадносных складаных прыметнікаў. Зафіксавана 30 такіх дэрыватаў. Паміж іх часткамі могуць быць розныя віды адносін:

– кампаненты складанага прыслоўя выступаюць сінонімамі ***(пяшчотна-цеплакрыла, імкліва-спешна, увысь-угару)***;
– кампаненты складанага прыслоўя з розных бакоў апісваюць дзеянне ці прыкмету ***(узрушана-няўцешна, бела-адчайна)***;
– кампаненты складанага прыслоўя выступаюць антонімамі ***(рана-позна)***;
– першы кампанент узмацняе семантыку другога, указвае на ступень выяўленасці дзеяння ці прыкметы ***(нечакана-лёгка, невыносліва-балюча)***.

Відаць, невыпадкова паэт змяшчае ў адну адзінку два фанетычна падобныя прыслоўі (стварэнне эфекту гукапісу): ***шчымліва-шчасна***: *Так, матылька спаткаўшы, матылёк /* ***Шчымліва-шчасна*** *крылцамі трапеча...*; ***зіхотка-з'інела***: *Як лісцё ціхазвонна звінела, / Як паволі зграяў далягляд, / Як у небе* ***зіхотка-з'інела*** */ Месяц ясны свой земіў пагляд...* Зафіксаваны адзін выпадак трохкампанентнага кампазіта: ***рыжа-ласкава-спакусна*** *(...Нашы з табою абдымкі, / Смелыя дотыкі вуснаў... / Як ты глядзіш з фотаздымкаў /* ***Рыжа-ласкава-спакусна!****)*. Стварэнне такой адзінкі выклікана і версіфікацыйнымі інтэнцыямі паэта. Нягледзячы на тое, што трохкампанентныя аказіянальныя прыслоўі звычайна абцяжарваюць паэтычны радок і рэдка бываюць удалымі, ***рыжа-ласкава-спакусна*** характарызуецца лёгкасцю, звонкасцю, выдатна падтрымлівае рытм.

Сярод разгледжаных аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану ёсць адзінкі (**3**), якія характарызуюцца наяўнасцю дадатковага склада ці, наадварот, адсутнасцю склада ў параўнанні з суадноснай кадыфікаванай адзінкай. Верагодна, такія фанетычныя трансфармацыі абумоўлены версіфікацыйнымі прычынамі, запатрабаваны пэўным рытмам у паэтычным радку: **знароку**: *Бялюткай чайкаю*

*з нябёс / Ты прыляцела, бы* ***знароку***; **неўпрыкметку**: *І вусны дакраналіся ў цішы, / І дагарала* ***неўпрыкметку*** *лета*...; **навыцяж**: *Зноў ад'езд, адыход, адлёт – / Распрамляем* ***навыцяж*** *крылы*... Зафіксавана 10 такіх слоў.

Асноўныя вынікі супастаўлення структурных разнавіднасцей аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану ў паэзіі Міколы Шабовіча прадстаўлены ў табліцы 1.

Структурныя разнавіднасці выяўленых аказіянальных слоў катэгорыі стану нічым не адрозніваюцца ад структурных разнавіднасцей аказіянальных прыслоўяў: **жніўна, восенна**: ***Жніўна****. Амаль што* ***восенна****... / Хутка спадуць лісты. / Срэбна-халоднымі росамі / Прыйдзеш, далёкая, ты.* Чатыры простыя сказы ў страфе (частка з якіх аднасастаўныя), фактычна адсутнасць службовых часцін мовы, два словы катэгорыі стану побач ствараюць напружана-гарманічную атмасферу паэтычнага радка, яго бездакорную музыку.

Некаторыя адзінкі ўжываюцца і як прыслоўі, і як словы катэгорыі стану: *З чым параўнаць мне дотык да шчакі / Тваіх цнатлівых матылёчкаў-вуснаў / І святасць слоў гарэзліва-п'янкіх, / Мне ад якіх і* ***мройна*** *і* ***спакусна****?..; Вясною, снег калі растане / І прыляцяць гракі, шпакі, / Прызначыш іншаму спатканне, / Туліцца будзеш да шчакі / І пазіраць* ***спакусна*** *ў вочы / На скрыжаванні дня і ночы...; Калі б я ведаў пра ўсё на свеце: / Дзе дождж начуе, не плача вецер, / Дзе песні-гулі снуюцца* ***мройна****, / Душы – шчымліва, наўсцяж – спакойна...*

Аказіянальныя прыслоўі і словы катэгорыі стану ствараюцца з мэтай надаць дзеянню ці прыкмеце ўнікальную, небанальную, вычарпальную характарыстыку. Часта паэт акцэнтуе чытацкую ўвагу менавіта на аказіянальным прыслоўі ці слове катэгорыі стану: 25 % зафіксаваным аказіянальным прыслоўям і словам катэгорыі стану папярэднічае прыслоўе меры і ступені *так*: *Канечне, гэта несуцешна, /* ***Так невынослівa-балюча****, / Хоць для цябе, магчыма, дробязь / (Чаму тут, быццам бы, балець!); На гэтай алеі / Бярозы бялелі /* ***Так бела-зялёна****; Абы ніколі не стаяць на месцы, / Абы імкнуцца гэты свет змяніць... / Няўжо напраўду паміж намі рвецца, /* ***Так нечакана-лёгка*** *рвецца ніць?..*

На думку А. Г. Лыкава, аказіянальнае слова ствараецца і ўжываецца толькі аднойчы ў адпаведнасці з асаблівасцямі пэўнай маўленчай сітуацыі [3, с. 115]. Аднак аналіз паэтычнай спадчыны М. Шабовіча паказаў, што некалькі разоў ужыты наступныя адзінкі: ***мройна*** (4 разы), ***спадзеўна*** (3 разы), ***спакусна*** (3 разы), ***мройліва*** (2 разы), ***вяснова*** (2 разы), ***няпрошана*** (2 разы). Аказіянальныя прыслоўі-кампазіты звычайна характарызуюцца функцыянальнай аднаразовасцю, аднак адна адзінка была зафіксавана двойчы: **імкліва-спешна**: *Але ў бярлогіі свае / Яна пайшла* ***імкліва-спешна****; Пажухлі кветкі на тваім прычале, / Няўмольны час ляціць* ***імкліва-спешна****.*

Мікола Шабовіч прысвяціў свае навуковыя пошукі менавіта аказіянальным словам. Аўтарская словатворчасць найбольш ярка праявілася ў беларускай літаратуры 20-х гг. XX ст., што абумоўлена тагачаснымі гістарычнымі падзеямі, патрэбай як у насычэнні мовы новымі словамі, так і ў самавыяўленні пісьменнікаў. Менавіта 20-я гг. XX ст. прыцягнулі ўвагу Шабовіча-лінгвіста, у выніку чаго пабачыла свет манаграфія «Аказіянальныя словы ў беларускіх мастацкіх тэкстах 20-х гадоў XX стагоддзя» (2013) [1], дзе прыводзіцца ў тым ліку індэкс аказіянальных слоў згаданага перыяду. Супастаўленне аказіянальных прыслоўяў 20-х гг. XX ст. і аказіянальных прыслоўяў, знойдзеных у паэтычных кнігах М. Шабовіча, паказала супадзенне толькі 1 адзінкі – ***ціхазвонна***: *І* ***ціхазвонна*** *і паволі восень лісцё наземіць, сцеле ў даліны* (У. Дубоўка) [1, с. 121]; *Як лісцё* ***ціхазвонна*** *звінела, / Як паволі зграаў даляргляд, / Як у небе зіхотказ'інела / Месяц ясны свой земіў пагляд...* (М. Шабовіч).

***Табліца 1*** **– Аказіянальныя прыслоўі і словы катэгорыі стану ў паэзіі Міколы Шабовіча**

| **Структурная разнавіднасць** | Утвораныя ад кадыфікаваных ад'ектываў з дапамогай суфікса *-а* | Утвораныя ад некадыфікаваных ад'ектываў з дапамогай суфікса *-а* | Утвораныя спосабам чыстага складання | Характарызуюцца наяўнасцю дадатковага склада ці адсутнасцю склада ў параўнанні з кадыфікаваным словам |
|---|---|---|---|---|
| **Колькасць (%)** | 36 | 23 | 31 | 10 |
| **Прыклады** | *птушына, вяснова, крылата, легкакрыла* | *успамінна, бязгнёзда, шарагова, бяспутна* | *годна-смела, задумна-мякка, зіхотка-прароча* | *ніца, знароку, навыцяж* |
| **Ужыты неаднаразова** | 6 слоў | 1 слова | 1 слова | – |

Такім чынам, аналіз 97 аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану, што зафіксаваны ў паэтычнай спадчыне Міколы Шабовіча, паказаў, што найбольшую групу адзінак склалі лексемы, утвораныя ад кадыфікаваных (36 %) або некадыфікаваных (23 %) ад'ектываў з дапамогай суфікса *-а*. З дапамогай кампазіцыі (чыстага складання) утвораны 31 % адзінак. Каля 10 % аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану характарызуюцца адсутнасцю ці, наадварот, наянасцю дадатковага склада ў параўнанні з кадыфікаваным словам. Каля 44 % аказіянальных прыслоўяў і слоў катэгорыі стану з'яўляюцца складанымі адзінкамі (у тым ліку зафіксаваны 1 трохкампаненты кампазіт).

Каштоўнасць словатворчасці вызначаецца адпаведнасцю мастацкаму заданню, цэласнасці твора [4, с. 184]. Даследчыкі мастацкіх тэкстаў ведаюць, што зварот да аказіяналізмаў часам становіцца неапраўданым выбарам, патрабуе асцярожнасці і лінгвістычна-паэтычнай чуйнасці ад кожнага творцы, аднак у адносінах да вершаў Міколы Шабовіча можна ўпэўнена сказаць: у іх няма няўдалых аўтарскіх дэрыватаў, лішніх, штучна-нязграбных і відавочна выпуклых. Выдатны мовазнаўца і беларускі лірык Мікола Шабовіч валодаў выключным адчуваннем слова і тэксту, што дазволіла створаным ім лексічным адзінкам арганічна ўвайсці ў лірычную плынь і, не абцяжарваючы, узбагаціць і аздобіць яе. «Падары мне сваю адзіноту», «Мая надзея», «Маладыя мроі маладога лета» і, канечне, апошняя прыжыццёвая кніга «Пад маміным крылом...» – гэта не толькі вытанчаная лірыка, але і непаўторны ў беларускай літаратуры ўзор павагі паэта і лінгвіста да роднага слова, замілавання яго дэрывацыйным патэнцыялам.


### *Літаратура*

1. *Шабовіч, М. В.* Аказіянальныя словы ў беларускіх мастацкіх тэкстах 20-х гадоў ХХ стагоддзя / М. В. Шабовіч ; навук. рэд. П. А. Міхайлаў. – Мінск : Логвінаў, 2013. – 198 с.
2. Беларуская граматыка : у 2 ч. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; рэд.: М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985–1986. – Ч. 1 : Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / А. І. Падлужны [і інш.]. – 1985. – 431 с.
3. *Лыков, А. Г.* Современная русская лексикология (русское окказиональное слово) : учеб. пособие / А. Г. Лыков. – М. : Высш. шк., 1976. – 119 с.
4. *Земская, Е. А.* Словообразование как деятельность / Е. А. Земская ; отв. ред. Д. Н. Шмелев. – 4-е изд. – М. : URSS : Либроксом, 2009. – 220 с.

### *References*

1. *Shabovich, M. V.* Akaziyanal'nyya slovy ŭ belaruskih mastackih tekstah 20-h gadoŭ HH stagoddzya / M. V. Shabovich ; navuk. red. P. A. Mihajlaŭ. – Minsk : Logvinaŭ, 2013. – 198 s.
2. Belaruskaya gramatyka : u 2 ch. / Akad. navuk BSSR, In-t movaznaŭstva ; red.: M. V. Biryla, P. P. Shuba. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1985–1986. – Ch. 1 : Fanalogiya. Arfaepiya. Marfalogiya. Slovaŭtvarenne. Nacisk / A. I. Padluzhny [i insh.]. – 1985. – 431 s.
3. *Lykov, A. G.* Sovremennaya russkaya leksikologiya (russkoe okkazional'noe slovo) : ucheb. posobie / A. G. Lykov. – M. : Vyssh. shk., 1976. – 119 s.
4. *Zemskaya, E. A.* Slovoobrazovanie kak deyatel'nost' / E. A. Zemskaya ; otv. red. D. N. Shmelev. – 4-e izd. – M. : URSS : Libroksom, 2009. – 220 s.


ВГЛДПУ